Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-01-17



# Невядомы Сяргей Прытыцкі

*(1 лютага 2013 года споўніцца 100 гадоў з дня нараджэння С.В.Прытыцкага)*

## Дакументальны нарыс

*(Заканчэнне. Пачатак у №№ 3 і 4 адпаведна за 12 і 15 студзеня 2013 года.)*

1 лютага 1954 года Прытыцкі быў выбраны першым сакратаром Маладзечанскага абкама партыі, а праз шэсць гадоў — 5 лютага 1960 года — першым сакратаром Мінскага абкама КПБ.

Аўтар гэтых радкоў у 1962 годзе быў вясковым настаўнікам, маладым камуністам, прапагандыстам камсамольскага звяна, членам прэзідыума Слуцкай раённай арганізацыі таварыства "Веды", старшынёй камісіі па вуснай і друкаванай прапагандзе Слуцкага райкама камсамола. На абласным семінары прапагандыстаў мне давялося сустрэцца з першым сакратаром Мінскага абкама партыі Сяргеем Восіпавічам Прытыцкім, слухаць яго выступленне перад прапагандыстамі і лектарамі таварыства "Веды" Мінскай вобласці. Мне запомнілася логіка і паслядоўнасць яго думкі, глыбокая перакананасць у справядлівасці сваёй справы і тонкае ўменне пераконваць слухачоў, менавіта не загадваць і палохаць нечым, а пераконваць. Калі ў перапынку Прытыцкага акружылі прапагандысты і лектары, ён коратка адказваў на іх пытанні. Не адчувалася высакамернасці. Запомнілася яго прастата і даступнасць. У тым жа 1962 годзе я з цікавасцю прачытаў выпушчаную ў Маскве брашуру С.В.Прытыцкага "Верныя памочнікі партыі" аб рабоце груп таварыства "Веды" Мінска і Мінскай вобласці, у якой былі выказванні Сяргея Восіпавіча з таго абласнога семінара.

18 снежня 1962 года С.В.Прытыцкага выбралі сакратаром ЦК КПБ, зацвердзілі старшынёй Камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР.

23 студзеня 1968 года Сяргей Восіпавіч выбраны Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, а 23 чэрвеня таго ж года — намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

З тых, хто быў на гэтай пасадзе, нямногія карысталіся такім аўтарытэтам і народнай любоўю, як С.В.Прытыцкі. За некалькі дзён да смерці ён напісаў артыкул "Аўтарытэт народнага прадстаўніка" для часопіса "Саветы дэпутатаў працоўных". Гэты артыкул можна лічыць духоўным запаветам Сяргея Восіпавіча, таму што ён аналізуе прынцыповыя, вострыя пункты работы Саветаў у БССР. Хаця з часу напісання артыкула прайшоў 41 год, але ён і сёння выключна актуальны. Давайце ўдумаемся ў словы С.В.Прытыцкага: "Аўтарытэт. Актыўнасць. Адказнасць. Усё гэта паняцці, туга сплеценыя, залежныя адно ад аднаго. Таму прэстыж народнага прадстаўніка ў многім залежыць ад таго, ці ўмее ён кваліфікавана выконваць свае абавязкі, ці мае неабходныя магчымасці. І тут ужо воляй-няволяй з асобы дэпутата мы пераключаемся пераважна на тых, хто закліканы дапамагчы яму стаць сапраўдным слугой народа. Маюцца на ўвазе, вядома, выканаўчыя органы, службовы апарат Саветаў, сродкі масавай інфармацыі...

...Калі б мяне спыталі, якім павінен быць выбраннік народа, я б, не вагаючыся, адказаў: выбраннік народа, а значыць, яго слуга, ва ўсіх сваіх справах павінен кіравацца не асабістымі ўяўленнямі, а інтарэсамі Радзімы, працоўных... Ветэраны напэўна нагадаюць навічкам, як важна кожнаму дэпутату з першых жа крокаў усвядоміць сябе менавіта дзяржаўным дзеячам".

Прытыцкі не цярпеў работнікаў бязвольных, нерашучых і безыніцыятыўных.

"Такому чалавеку нельга давяраць ні ў вялікай, ні ў малой справе", — казаў ён.

Нягледзячы на тое, што Сяргей Восіпавіч не меў ніякай навуковай ступені, ён быў таленавітым даследчыкам гісторыі Заходняй Беларусі, асабліва Камуністычнай партыі і Ленінскага камсамола Заходняй Беларусі, я б нават сказаў — гісторыкам-аналітыкам.

Што тычыцца Сяргея Восіпавіча, то ён пачаў сур'ёзна вывучаць гісторыю Заходняй Беларусі, асабліва гісторыю Кампартыі і Ленінскага камсамола Заходняй Беларусі значна раней — у канцы 1940-х гадоў. Першай ластаўкай у даследаванні гэтай складанай і заблытанай тэмы (*не варта забываць, што рэабілітацыя дзеячаў КПП, КПЗБ і КСМЗБ пачалася толькі ў 1956 годзе. —* **Э.І.**) стаў артыкул "Зоры над Нёманам", апублікаваны ў 44-м нумары часопіса "Огонёк" за 1949 год.

Вынікам даследчай работы Прытыцкага стаў вялікі артыкул "У імя шчасця працоўнага народа", апублікаваны ў зборніку "У суровыя гады падполля" (Мн., 1958). Яго аб'ём — 33 старонкі. На першы погляд, гэта асабістыя ўспаміны Прытыцкага аб уласнай рэвалюцыйнай дзейнасці. На самай справе, перад намі гістарычны нарыс аб рэвалюцыйным руху, партыйным і камсамольскім падполлі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гадах.

Дзеля аб'ектыўнасці, варта сказаць, што Сяргей Восіпавіч быў адным з першых гісторыкаў партызанскага руху ў Гродзенскай вобласці ў 1941—1944 гадах. Пра гэта сведчыць дэталёвы аналіз яго артыкула "Партызанскі рух на Гродзеншчыне" аб'ёмам у 15 старонак, апублікаванага ў зборніку "Партызанская барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны" (Мн., 1959). На аснове фактычнага матэрыялу і асабістых успамінаў аўтар аднавіў незабыўную гераічную эпапею народнай вайны з нацысцкімі захопнікамі, якая разгарнулася на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

Вельмі важна, што Прытыцкі ўдзяліў асаблівую ўвагу ўзнікненню і баявой дзейнасці першых партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі вобласці.

У яго рабоце былі такія радкі: "Ужо летам 1941 года на поўдні Белавежскай пушчы, у раёнах Бельска, Гайнаўкі, Заблудава, была арганізавана група партызан да 70 чалавек пад камандаваннем капітана Чырвонай Арміі Васіля Трафімовіча.

З першых дзён Айчыннай вайны ў Гродзенскім раёне пачалі актыўныя дзеянні супраць нямецкіх захопнікаў 13 партызан пад камандаваннем Аўдоніна. Хутка гэтая група вырасла да 30 чалавек".

Аналізуючы розныя гістарычныя крыніцы, Сяргей Восіпавіч прыйшоў да высновы, што ў Гродзенскім раёне ўжо да студзеня 1944 года было створана 9 падпольных антыфашысцкіх арганізацый і 17 баявых партызанскіх груповак.

Ёсць усе падставы лічыць гістарычным нарысам артыкул Прытыцкага "Салдат партыі", надрукаваны ў "Праўдзе" за 18 мая 1960 года і прысвечаны Герою Савецкага Саюза Веры Харужай. Менавіта Сяргей Восіпавіч, будучы першым сакратаром Мінскага абкама партыі, садзейнічаў пасмяротнаму ўзнагароджанню палымянай падпольшчыцы і патрыёткі.

Мала каму вядома, што, нягледзячы на тое, што Сяргей Восіпавіч закончыў толькі аднагадовую партыйную школу КПЗБ у 1935 годзе і трохгадовую Вышэйшую партыйную школу пры ЦК УКП(б), ён быў адным з самых эрудзіраваных партыйных і дзяржаўных дзеячаў Беларусі. На думку Міхася Лынькова, Прытыцкі быў чалавекам шырокага кругагляду, які меў добры запас разнастайных ведаў і цікавіўся ўсім, што адбывалася ў розных сферах жыцця сучаснага свету, быў своеасаблівым самародкам, які папаўняў свае веды самаадукацыяй.

У гутарцы з аўтарам гэтых радкоў Іраіда Восіпаўна Царук (Прытыцкая) успамінала: "Сяргей Восіпавіч даволі добра ведаў рускую і беларускую літаратуру, нядрэнна — польскую, цёпла ставіўся да Петруся Броўкі, Кандрата Крапівы, Пімена Панчанкі, Піліпа Пестрака, любіў паэзію. Шмат ведаў на памяць з вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа. Чытаў і меў сваю думку аб творах Генрыха Сенкевіча і Стэфана Жаромскага, Віліса Лацыса і Яна Райніса. Таму тэмы для гутарак і размоў з гэтымі паэтамі і празаікамі заўсёды былі. Нярэдка яны абмяркоўвалі бытавыя, гаспадарчыя справы, а таксама тое, чым Прытыцкі займаўся штодзённа.

У 1934 годзе ён вучыўся ў Мінску, у партыйнай школе КПЗБ пад мянушкай Янка. У той час усе навучэнцы мелі мянушкі, а свае сапраўдныя імёны і прозвішчы яны не маглі называць. Штогод у школе вучылася 25—30 падпольшчыкаў і членаў партыі і камсамола Заходняй Беларусі. Яна знаходзілася спачатку ў прыгарадзе Мінска — Лошыцы, а потым — на ўскрайку горада — на Грушаўскай вуліцы. Беларускую і рускую літаратуру ў партыйнай школе КПЗБ выкладаў Міхась Лынькоў. Ніхто не ведаў, што ён пісьменнік, для іх ён быў Владэк Бельскі.

У 1950-я гады, калі Прытыцкі быў першым сакратаром Баранавіцкага, а потым Маладзечанскага абкама партыі, сям'я Сяргея Восіпавіча любіла ездзіць на возера Нарач яшчэ і таму, што там можна было сустрэцца з сябрамі — Міхасём Лыньковым, Максімам Танкам, Аркадзем Куляшовым, дзе ў іх былі дачы. Успаміналі падполле, турэмныя "ўніверсітэты", загінуўшых сяброў. Зноў і зноў вярталіся ў размовах да першага сакратара ЦК камсамола Заходняй Беларусі Мікалая Дворнікава, Веры Харужай".

...У 1971 годзе, хутка пасля смерці Сяргея Прытыцкага, недалёка ад будынка Прэзідыума АН БССР, я, будучы аспірантам Інстытута гісторыі Акадэміі навук, выпадкова сустрэўся з акадэмікам Міхасём Лыньковым. Мяне цікавіла загадка смерці Янкі Купалы. Але ад размовы на гэтую тэму Міхась Ціханавіч ухіліўся. Не памятаю, як размова перайшла да нядаўняй смерці С.В.Прытыцкага. І тады Лынькоў заўважыў: "А я ж вучыў яго 37 гадоў таму". Потым я спытаў: "Міхаіл Ціханавіч, дзе гэта было і што вы можаце аб ім сказаць?". І вось што я пачуў: "Я сустракаўся з Сяргеем Прытыцкім у 1934—1935 гадах па некалькі разоў у тыдзень. Тады я не ведаў яго сапраўднага імя і прозвішча. Як і ўсе, называў яго Янкам.

Як цяпер бачу яго. Гэта быў высокі чалавек з мяккімі, выразнымі рысамі твару. Шэрыя задумлівыя вочы. Я адзначыў пра сябе яго мэтанакіраванасць, павагу і аўтарытэт сярод таварышаў, бачыў, што многія слухачы школы хочуць зблізіцца з Янкам.

Восенню 1939 года, будучы рэдактарам газеты Беларускага фронту "Беларуская зорка", я выпадкова сустрэўся ў Беластоку з Сяргеем Восіпавічам Прытыцкім, а потым у кастрычніку 1939 года слухаў яго даклад на Народным сходзе Заходняй Беларусі".

І тады я задаў М.Ц.Лынькову апошняе пытанне: "А пасля вайны вы сустракаліся?".

"Так, — адказаў Міхась Ціханавіч, — і неаднаразова. Апошнія дзесяцігоддзі я сустракаўся з Сяргеем Восіпавічам у Маладзечне, у Мінску і яго ваколіцах, на возеры Нарач і ў іншых мясцінах. Хачу прызнацца: я любіў яго як чалавека, як самага блізкага сябра. У яго была добрая якасць, якая адрознівала яго ад многіх партыйных і дзяржаўных дзеячаў, — гаварыць суразмоўцы праўду, якой бы непрыемнай яна ні была. І яшчэ абвостранае пачуццё справядлівасці і ўласная думка па шэрагу ключавых пытанняў гісторыі і культуры Беларусі.

Неаднаразова я быў у гасцях у Сяргея Восіпавіча. Неаднойчы і ён з сям'ёй быў у мяне ў Мінску і на нарачанскай дачы.

Вельмі шкада, што пайшоў з жыцця такі аптыміст, вясёлы чалавек, з пачуццём гумару, аматар добрай песні, які аддаў сваё кароткае жыццё людзям, усяму нашаму народу".

...Некалькі слоў аб сям'і Сяргея Восіпавіча.

У 1943 годзе ён ажаніўся з Таццянай Іванаўнай Гаварэнь. Яму ў той час было 30 гадоў, а ёй — 22 гады. Таццяна Іванаўна нарадзілася 25 кастрычніка 1921 года ў горадзе Дзямідаў Смаленскай вобласці. З 1938 па 1941 год вучылася ў Кіеўскім дзяржаўным універсітэце імя Т.Р.Шаўчэнкі. (*У пятым томе шасцітомнай "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (Мн., 1999. С. 584) памылкова ўказана, што Т.І.Прытыцкая ў 1942 годзе закончыла Кіеўскі дзяржаўны ўніверсітэт. —* **Э.І.**). На самай жа справе ў 1942 годзе пасля заканчэння спецшколы ў Маскве яна была накіравана ў тыл ворага для выканання спецыяльнага задання ў якасці інструктара ЦК ЛКСМБ. У 1944—1945 гадах Таццяна Іванаўна была памочнікам начальніка аддзела кадраў Польскага штаба партызанскага руху. З 1945 па 1948 год яна вучылася разам з Сяргеем Восіпавічам у ВПШ пры ЦК УКП(б). У 1954 годзе Т.І.Прытыцкая абараніла кандыдацкую, а ў 1975 годзе — доктарскую дысертацыю па гістарычных навуках. З 1954 па 1992 год яна працавала ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Прафесар Таццяна Іванаўна Прытыцкая ў 1967—1989 гадах загадвала кафедрай гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў БДУ. Яна была ўзнагароджана ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, многімі медалямі, урадавымі ўзнагародамі Польскай Народнай Рэспублікі.

Т.І.Прытыцкая перажыла свайго мужа на 39 гадоў і памерла ў 2010 годзе.

У іх сям'і нарадзіліся дзве дачкі. Наталля Сяргееўна Прытыцкая стала фізікам і працавала ў Дзяржплане БССР, а Тамара Сяргееўна — кандыдатам хімічных навук, навуковым супрацоўнікам БДУ.

Кажучы аб дзецях Тамары (унуках Сяргея Восіпавіча), варта адзначыць, што Таццяна стала рэжысёрам, Сяргей — хімікам, навуковым супрацоўнікам лабараторыі сусветна вядомага вучонага — акадэміка Лебедзева ў Маскве, а Тамара працуе псіхолагам і завочна вучыцца ў аспірантуры.

Мала каму вядомы трагічны лёс старэйшага брата Сяргея Прытыцкага — Аляксандра, дзякуючы ўплыву якога ён стаў рэвалюцыянерам і падпольшчыкам. Член КПЗБ з 1923 года, сакратар Гродзенскага акруговага камітэта партыі Аляксандр Прытыцкі ў 1934 годзе пры пераходзе польска-савецкай мяжы быў арыштаваны, асуджаны і знаходзіўся ў канцлагеры ў Сібіры. Пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР С.В.Прытыцкі, знаходзячыся ў Маскве, ва ўсіх інстанцыях хадайнічаў аб вызваленні брата. Дапамог член Аргбюро ЦК УКП(б), 1-ы сакратар УЦСПС, старшыня Савета нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР М.М.Швернік. Пасля вызвалення Аляксандр Прытыцкі працаваў старшынёй калгаса. У 1942 годзе як партыйны актывіст ён быў расстраляны нацыстамі.

35 гадоў таму ў Мінску выйшла ў свет кніга "Жыццё, аддадзенае народу", у якой былі змешчаны артыкулы і прамовы С.В.Прытыцкага, дакументы і ўспаміны аб ім. Гэта кніга адкрываецца ўводным артыкулам П.М.Машэрава "Народны герой".

Пётр Міронавіч пранікліва пісаў аб сваім саратніку: "Сяргей Восіпавіч Прытыцкі на любой пасадзе працаваў не пакладаючы рук, не скардзячыся на стому і недамаганні. Мала хто ведаў, што мы, працуючы з ім побач, ведалі, што яго арганізм, падарваны перанесенымі ў мінулым цяжкімі ранамі, здзекамі і катаваннямі, быў цяжка хворы. Ён з надзвычайнай мужнасцю перамагаў боль і пакуты, звязаныя з хваробай, захоўваў да апошняй хвіліны, да апошняга ўдару свайго сэрца дзіўную працаздольнасць, яснасць думкі і стойкасць духу. Здавалася, няма зносу гэтаму жалезнаму чалавеку, няма мяжы яго жыццялюбству і светламу аптымізму... С.В.Прытыцкі заваяваў сабе права на бессмяротнасць".

Сяргей Восіпавіч быў узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, дзесяццю медалямі, у тым ліку "Партызану Айчыннай вайны 1-й ступені", сямю польскімі ўрадавымі ўзнагародамі і адной чэхаславацкай урадавай узнагародай.

Імем С.В.Прытыцкага названы вуліцы ў Мінску, Гродне, Баранавічах і Маладзечне, хімічны камбінат у Гродне. У Мінску на доме, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка. Аб рэвалюцыйнай дзейнасці Прытыцкага створаны мастацкі кінафільм "Чырвонае лісце".

Яркае жыццё і кіпучая, плённая дзейнасць Сяргея Прытыцкага дастойны грунтоўнай манаграфіі, новага дакументальнага і мастацкага фільма, дастойны таго, каб памяць аб ім назаўжды засталася для беларускага народа.

**Эмануіл ІОФЕ,**
**прафесар БДПУ імя Максіма Танка,**
**доктар гістарычных навук.**

Калектыў дзяржаўнай установы адукацыі "Гомельскі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі" глыбока смуткуе з прычыны смерці метадыста аддзела масавага і спартыўнага турызму ўстановы адукацыі "Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства" **Мікалая Віктаравіча КАЖЭНАВА** і выказвае шчырыя спачуванні сям'і, родным і блізкім нябожчыка ў сувязі з напаткаўшым іх горам і незаменнай стратай.

ISSN 1994-9146

9 771994 914000 13005

Галоўны рэдактар Вадзім Кнышаў

Эмануіл Іофе. Невядомы Сяргей Прытыцкі